- Цяжкасць маўлення або разумення простых сказаў.
- Галавакружэнне, страта раўнавагі або каардынацыі, асабліва ў спалучэнні з парушэннем маўлення, дваеннем у вачах, аняменнем або слабасцю.
- Раптоўны, інтэнсіўны галаўны боль.

Любы з пералічаных сімптомаў — падстава для таго, каб тэрмінова звярнуцца па дапамогу, — не чакайце, пакуль «усё само пройдзе», вы можаце ўпусціць каштоўны час.

Лячэнне інсульту праводзіцца ва ўмовах спецыялізаванага стацыянара.

Пасля выпіскі хворы застаецца пад наглядам медыкаў на ўсё астатняе жыццё. Назіранне ў неўролага паліклінікі і рэгулярнае курсавое лячэнне неабходнае нават у тым выпадку, калі хворы і яго родныя не адзначаюць далейшага аднаўлення страчаных функцый. Калі спыніць падтрымліваючае лячэнне, паступова страціцца і тое, чаго ўдалося дасягнуць.

Перанесены інсульт — гэта заўсёды цяжкая псіхалагічная траўма. Чалавек мяняе свой сацыяльны статус, становіцца залежным ад навакольных, кола яго магчымасцяў і інтарэсаў рэзка звужаецца. Усё гэта ў спалучэнні з метабалічнымі працэсамі, што адбываюцца пры інсульце ў галаўным мозгу, у 70% выпадкаў прыводзяць да развіцця пасляінсультнай дэпрэсіі. Яе лячэнне патрабуе не толькі і не столькі медыкаментознай карэкцыі, колькі дапамогі псіхатэрапеўта і спачування блізкіх. Хворы павінен адчуваць, што па-ранейшаму дарагі і патрэбны родным, нягледзячы на сваю бездапаможнасць. Даказана, што больш актыўна лечацца і лепш аднаўляюцца тыя пацярпелыя, якія з дапамогай сваіх блізкіх здолелі знайсці сябе ў новай сацыяльнай ролі: ужо не кармільца, але мудрага дарадчыка, сябра, любімага члена сям'і. Нельга забываць, што цяжкі псіхалагічны стрэс адчуваюць не толькі хворыя, але і іх родныя. На іх кладзецца асноўны цяжар лячэння, догляду, клопату аб хворым. Часам забеспячэнне жыццёвых патрэб аднаго хворага значна мяняе існаванне цэлай сям'і. Каб сітуацыя не стала нясцерпнай, трэба знаходзіць магчымасць адпачынку для кожнага члена сям'і, раўнамерна размяркоўваць нагрузку і адказнасць.

Неабходна памятаць, што лячэнне хворых, якія перанеслі інсульт, павінна спалучацца з прафілактыкай паўторнага інсульту. Вялікае значэнне тут мае здаровы лад жыцця, што ўключае адмову ад курэння, алкаголю і наркотыкаў, рэгулярныя фізічныя нагрузкі, абмежаванне ўжывання солі, падтрыманне ідэальнай масы цела, кантроль і пры неабходнасці зніжэнне артэрыяльнага ціску, узроўню цукру ў крыві і ўзроўню халестэрыну, прыём прэпаратаў, што змяншаюць вязкасць крыві. Мэтазгодна адмовіцца ад ужывання прадуктаў, якія змяшчаюць вялікую колькасць халестэрыну (сметанковае масла, яйкі, тлустае мяса і інш.), і павялічыць у рацыёне колькасць свежай агародніны, садавіны, крупаў, морапрадуктаў.

**Існуе пералік даследаванняў, якія дазваляюць выявіць фактары рызыкі развіцця інсульту і своечасова пачаць прафілактыку гэтага захворвання.**

- **Ведайце свой артэрыяльны ціск**, таму што артэрыяльная гіпертэнзія — асноўная прычына развіцця інсульту. Нават чалавеку з нармальнымі лічбамі ціску неабходна правяраць яго хоць бы два разы на год. А калі ваш верхні (сісталічны) ціск пастаянна вышэйшы за 140, а ніжні (дыясталічны) вышэйшы за 90, пракансультуйцеся з урачом. Ён прызначыць дыету, фізічныя практыкаванні або медыкаментозную тэрапію.
- **Даведайцеся, ці няма ў вас парушэнняў рытму, мігання перадсэрдзяў.** Гэта нерэгулярныя сардэчныя скарачэнні, якія парушаюць нармальны ціск крыві, з-за чаго яна можа застойвацца ў некаторых аддзелах сэрца, згусаць. Частка тромба агульным крывацёкам можа быць занесена ў галаўны мозг і закупорыць прасвет мазгавога сасуда.
- **Праверце ўзровень халестэрыну і ліпідны спектр.** Парушэнне халестэрынавага абмену вядзе да развіцця атэрасклерозу, утварэння бляшак, звужэння сасудаў.
- **Павышае рызыку развіцця інсульту наяўнасць цукровага дыябету.** Гэту рызыку можна зменшыць уважлівымі адносінамі да харчавання, ладу жыцця, кантролем цукру крыві і дакладным падборам цукрапаніжальных прэпаратаў.
- **Шкодныя звычкі павялічваюць рызыку развіцця інсульту.**

Самым небяспечным у гэтым плане з'яўляецца курэнне — у 2,5 раза павялічваецца рызыка развіцця сасудзістай катастрофы ў курцоў.

Бакал чырвонага віна штодзень можа служыць прафілактыкай развіцця інсульту (калі няма іншых прычын пазбягаць ужывання алкаголю), а вось залішняя колькасць ужытага алкаголю павышае рызыку развіцця інсульту. Пры гэтым варта памятаць, што алкаголь можа ўзаемадзейнічаць з лекамі, якія вы прымаеце, і вельмі небяспечны ў вялікіх дозах.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

| Наименование предмета аукциона | Здание конторы лесничества и право заключения договора аренды земельного участка | Подсобное хозяйство и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская обл., Кобринский р-н, д. Дивин, ул. Ленина, 65 | Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Горавица |
| Продавец недвижимого имущества | ГОЛХУ «Кобринский опытный лесхоз», тел. 801642 2 20 50, 2 74 77 | ГЛХУ «Дрогичинский лесхоз», тел. 801644 3 64 16, 3 64 20 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание конторы 1-этажное, площадь – 130,5 кв.м, уборная, сарай, забор. Земельный участок площадью 0,2746 га, срок аренды – 50 лет. | Здание свинофермы 1992 г.п., площадь – 252,2 кв.м; пристройка, водонапорная башня; здание зернохранилища 1988 г.п, площадь – 308 кв.м; здание коровника 1987 г.п. площадь – 401,3 кв.м, весовая, сарай. Земельный участок площадью 0,8121 га, срок аренды – 50 лет. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 4 354 277 | 112 493 609 |
| Сумма задатка, руб. | 435 000 | 11 249 000 |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63, www. brest–region.by | |

Аукцион состоится 1 сентября 2009 года в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 31.08.2009 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 31 августа 2009 года включительно.**


Псіхатэрапія

# Адчуваеце сябе як выцiснуты лімон?

Магчыма, вы стаміліся фізічна, а, можа, эмацыянальна. Падтрыманню вашай фізічнай энергіі садзейнічае правільнае харчаванне, заняткі спортам і адпачынак. Але ж і эмацыянальны энергетычны ўзровень таксама патрабуе да сябе ўвагі.

Як жа зноў адчуць сябе энергічным, поўным сілаў, надзей і натхнення? У гэтым вам дапамогуць наступныя парады.

- Перастаньце жыць у імя дабрабыту іншых. Навучыцеся гаварыць «не», калі вас просяць зрабіць тое, што вы не хочаце рабіць. Будзьце самі сабой і рабіце тое, што падабаецца вам. Калі вы жывяце ў імя дабрабыту іншых, то гэта, безумоўна, добра, але вы затрачваеце намаганні, а нехта, нават не прыклаўшы рук, атрымлівае выгаду. Гэта прыводзіць вас да эмацыянальнага знясілення. Таму перастаньце непакоіцца аб навакольных, калі гэта ідзе на шкоду вашаму здароўю, і займіцеся сабой і сваімі патрэбамі.
- Кантактуйце з пазітыўна настроенымі людзьмі. Пазбягайце стасункаў з тымі, хто пастаянна ные, скардзіцца на свае праблемы і ўцягвае ў іх вас. Яны заражаюць вас сваім негатывам і «высмоктваюць» з вас усе жыццёвыя сокі. Кантакты ж з жыццярадаснымі людзьмі, наадварот, надаюць вам жыццёвую энергію. І заўсёды памятайце, што не трэба станавіцца падобнымі на першую катэгорыю асобаў.
- У вашых планах на будучыню заўсёды павінна быць вялікая і прыемная падзея. Калі ў вашых планах на будучыню ёсць штосьці прыемнае, гэта стымулюе вас, прымушае раніцай падымацца з ложка і дзейнічаць. З вашых надзей на будучыню вы чэрпаеце новую энергію, якая дазваляе вам ісці да намечанай мэты і дасягаць яе.
- Ніколі не жывіце мінулым. Перастаньце думаць пра тое, што б магло, напрыклад, адбыцца, калі б вы не рассталіся са сваім былым партнёрам або калі б вы не кінулі папярэднюю працу і не перайшлі на новую. Наадварот, сканцэнтруйцеся на рэчаіснасці і падумайце, што вам трэба зрабіць цяпер, каб рухацца далей. Сваімі рашэннямі і думкамі вы мадэлюеце будучыню. Такі падыход значна больш садзейнічае захаванню вашай жыццёвай актыўнасці.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# НЯХАЙ НАРМАЛЬНЫМ БУДЗЕ ЦІСК

**Колькі чалавеку наканавана жыць, залежыць ад кода, закладзенага Прыродай, лёсу, здароў'я... І калі на два першыя фактары чалавек паўплываць не можа, то здароўе залежыць і ад яго. Але якраз яму мы часта надаём мала ўвагі.**

У немаладым узросце ўсё часцей напамінае пра сябе сэрца, якое пачынае рэагаваць на ўсе негатыўныя моманты. Крыху пахваляваўся — і падскочыў ціск, мяняецца надвор'е — і галаву «ломіць»...

Вось чаму ў кожнай сям'і павінен быць танометр. Але гэты прыбор у нас яшчэ рэдкасць. На пад'езд адзін, а ў вёсцы ўвогуле ніводнага, хоць там амаль усе пенсіянеры.

Мільён можна прыхаваць ці пакласці пад працэнты, пенсію перадаць дачцэ ці сыну, нават на гарэлку не шкада, а вось за 36 тысяч купіць танометр — не. Давялося аднойчы назіраць такі малюнак. Сядзіць пенсіянерка бледная, як пабеленая сцяна.

— Што з вамі? — пытаецца мая жонка. — Можа доктара выклікаць?

— Ды штосьці з галавой стала. Таблетак у Гэлі ўзяла, але не памагаюць, — шэпча жанчына.

Аказалася, што ў суседкі ціск павышаны, і тая Гэля п'е лякарства, а ў нашай знаёмай паніжаны, і яна папрасіла тую таблетку...

Цікава, што да танометра пажылыя людзі ў вёсцы ставяцца з пашанай.

— Здаецца, палегчала, — кажа бабуля пасля таго, як у яе памералі ціск.

Я не спецыяліст у медыцынскай сферы, каб даваць парады, але танометр, як і тэрмометр, заўсёды павінен быць пад рукой.

Па сабе ведаю, што калі ў мяне ціск 110 ці 130, то адчуваю сябе кепска, бо 120 — мая норма. У прынцыпе я магу абыходзіцца без танометра, бо вялікіх разбежак няма. А вось у жонкі гэтыя хістанні істотныя. Раніцой 140, а ў абед ужо 180, а здараецца, і за 200. Тут неабходны пастаянны кантроль, каб прыняць лякарства. Дарэчы, яна яго п'е рэгулярна, а не толькі тады, калі становіцца кепска. Іншая справа — у якой дозе.

А ўзяцца за гэты артыкул надумаў пасля таго, як даведаўся, што ў Іванаўскім раёне была праведзена наступная акцыя.

Улічваючы, што колькасць тых, хто пакутуе ад артэрыяльнай гіпертэнзіі, з кожным годам узрастае, галоўны ўрач раёна Юрый Ільюшчакоў прапанаваў дэпутатам райсавета сабраць грошы і купіць танометры, каб затым перадаць іх у населеныя пункты, дзе няма ФАПаў і амбулаторый.



І вось на сабраныя больш як 1 млн 800 тыс. рублёў купілі 48 танометраў, якія перадалі ў вёскі. Там на месцы старшыні сельскіх Саветаў і старасты знайшлі людзей, якія і будуць у сваіх вёсках вымяраць ціск у тых, хто мае патрэбу. Працэдура даволі простая, але ўсё ж неабходна, каб чалавек з тым прыборам мог абыходзіцца, і пры высокім ці нізкім ціску зрабіць адпаведныя захады.

Акцыю з танометрамі трэба ўхваліць, але мне здаецца, што і самі людзі павінны клапаціцца аб сваім здароўі. Няўжо дзеці не могуць бацькам купіць гэты, такі неабходны ў старасці, недарагі апарат?

Аднойчы пытаюся ў знаёмай, якая жыве ў вёсцы з водаправодам і асфальтам, дзе яна пры сваім высокім ціску мерае яго?

— А тут у нас няма ні ў кога. Вось, бывае, дактары прыедуць з раёна ды і памераюць, — быў адказ.

Урачы пастаянна нагадваюць, што артэрыяльны ціск неабходна кантраляваць, але далёка не ўсе іх слухаюць.

Успамінаецца апавяданне М. Булгакава. Мужыкі вярнуліся ў вёску з вайны і прывезлі сіфіліс. Прыходзяць затым да доктара і просяць мазі. Урач пачынае тлумачыць чалавеку, што ў яго цяжкая хвароба...

— Ён нічога не разбіраецца, — расказвае мужык знаёмым, — мне трэба мазь, а ён нешта выдумляе.

Часта даводзіцца чуць, як пажылыя ўздыхаюць:

— Трэба дапамагчы дзецям, трэба падтрымаць унукаў....

Лепш будзе, калі вы падтрымаеце сябе, набудзеце танометр, пражывяце лішні год і не ляжаце цяжарам заўчасна на рукі сваіх дзяцей. Так будзе лепш усім.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Інфарм-укол

## Чым вышэй, тым... не лепш

**У здаровага чалавека артэрыяльны ціск не павінен перавышаць 140/90 мм рт сл. На ціск, як вядома, можна ўплываць. Для гэтага неабходна:**

- нармалізаваць вагу,
- больш рухацца,
- ужываць менш салёнай ежы,
- есці больш агародніны і садавіны,
- не злоўжываць алкаголем,
- не курыць.

## Не так страшны стрэс...

**1.** Вучыцеся дзяліцца праблемамі з блізкімі людзьмі.

**2.** Не грэбуйце прагулкамі на свежым паветры і фізічнымі практыкаваннямі.

**3.** Віват, здаровы, 8-гадзінны сон!

**4.** Шукайце станоўчыя эмоцыі — схадзіце ў тэатр, на канцэрт, сустрэньцеся з сябрамі.

**5.** Пазбягайце думак пра адзіноту.

**6.** Як мага часцей усміхайцеся, настройвайце сябе на тое, што ўсё будзе добра.

**7.** Майце на ўвазе: ніхто за вас не асвоіць навуку быць шчаслівым.

## Здаецца, проста ходзім...

**Неабходнасць кантраляваць свае думкі, пачуцці і дзеянні патрабуе, каб чалавек быў «у форме». У іншым выпадку перашкоды здаюцца большымі, чым ёсць насамрэч. Прагулка на свежым паветры дапамагае пазбавіцца дэпрэсіі і трывожнасці. Нават 30 хвілін хады ў дзень дапамагаюць нам:**

— набрацца сілаў
— папярэдзіць паражэнне каранарных сасудаў сэрца
— зняць стрэс
— падтрымаць вагу на нармальным узроўні
— умацаваць мускулатуру
— падтрымаць працаздольнасць
— папярэдзіць і лячыць артэрыяльны ціск
— рэгуляваць узровень цукру ў крыві
— папярэдзіць станчэнне касцей
— лепей спаць.

## Кінуць курыць: раз — і кропка

**Паспрабуйце не думаць пра цяжкасці, якія вас чакаюць. Прызначце дзень адмаўлення. Можна зрабіць блізкім падарунак, і абраць такім днём дзень нараджэння каго-небудзь з іх.**

Не хавайце свайго рашэння ад навакольных, а наадварот, папрасіце аб падтрымцы.

Неабходна пастарацца адначасова вынішчыць і іншыя звычкі, якія адпавядаюць вашаму тыпу курэння: ранішняя кава з цыгарэтай, цыгарэта з пачаткам працоўнага дня, цыгарэта як спадарожнік выпіўкі і г.д.

Так, вы прывыкалі да цыгарэты доўгі час і лёгка адмовіцца ад апошняй наўрад ці ўдасца. Аднак, галоўнае — памятаць, дзеля чаго вы вырашылі ўсё ж такі папрацаваць над сабой.

Майце на ўвазе, што любая залежнасць — досыць складаны працэс, фарміраванне якога дагэтуль вывучаецца. Аднак ніхто лепей за вас не ведае, чаму менавіта вы сталі «ахвярай» такой незайздроснай сітуацыі.

## Больш стэрыльнасці — бліжэй да алергій і бранхіяльнай астмы

**Стэрыльныя ўмовы пражывання дзяцей спрыяюць росту ў іх колькасці алергічных станаў і бранхіяльнай астмы, 2/3 выпадкаў якой маюць алергічнае паходжанне.**

Паводле слоў спецыялістаў, гэта той выпадак, калі чалавек плаціць за дасягненні цывілізацыі. Стэрыльныя ўмовы ў гэтым выпадку — паняцце шырокае. Гэта і малая колькасць дзяцей у сем'ях, і інтэнсіўная барацьба чалавецтва з інфекцыйнымі агентамі, і проста выхаванне падалей ад прыроды і чыстага паветра. Паводле слоў **загадчыка кафедры паліклінічнай педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Уладзіміра ЖАРНАСЕКА**, бранхіяльная астма лічыцца экалагічна залежным захворваннем.

Дарэчы, адна са свежых тэорый росту распаўсюджанасці памянёных захворванняў атрымала назву гігіенічнай. Справа ў тым, што імунная сістэма не можа заставацца бяздзейснай. Актыўная барацьба чалавецтва з інфекцыйнымі агенцтвамі вымушае імунітэт «стымулявацца» іншымі фактарамі. Напрыклад, алергічнымі агентамі.

— Алергіі найчасцей сустракаюцца бліжэй да 1 году жыцця, — кажа Уладзімір Фёдаравіч. — З узростам частата праблемы нарастае. Наогул, згодна з замежнымі звесткамі, 10-20 працэнтаў дзіцячага насельніцтва маюць алергічныя праяўленні з боку скуры ці дыхальных шляхоў — алергічны дэрматыт, алергічны рыніт ці бранхіяльную астму. Дакладны ўзровень распаўсюджанасці гэтай паталогіі ў Беларусі не вядомы, паколькі апошнія эпідэміялагічныя даследаванні праводзіліся даўно...

Медыцынскі тэрмін «алергічнага маршу» крок за крокам адлюстроўвае рызыку развіцця бранхіяльнай астмы ў дзяцей:

1. Спадчыннасць. Рызыка ўзнікнення алергічнага стану ў дзяцей, чые бацькі не мелі падобнай праблемы, складае 5-10 працэнтаў. Калі ж алергікі абодва бацькі, рызыка захворвання для іх дзіцяці ўзрастае да 60-80 працэнтаў.

2. Ранняе штучнае выкормліванне і як следства, развіццё харчовай алергіі.

3. Алергія дыхальных шляхоў — на пыл, шэрсць хатніх жывёл, пылок.

4. Хранічныя ачагі інфекцый насаглоткі.

5. Працяглае і бескантрольнае лячэнне антыбіётыкамі, гарачкапаніжальнымі прэпаратамі.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко»:
# ТРАДЫЦЫІ ЯКАСЦІ, КАМФОРТУ, СТЫЛЬНАСЦІ



Айчынны рынак скарыла марка «Марко», упэўнены генеральны дырэктар прадпрыемства Мікалай МАРТЫНАЎ. Сёння большасць айчынных і замежных пакупнікоў вызначаюць марку «Марко» дзякуючы іміджу паспяхова сфарміраванага беларускага брэнда. Як вынік, па заканчэнні штогадовага міжнароднага фестывалю-конкурсу «Выбар года» пяты раз запар СТАА «Марко» пацвярджае высокае званне «Айчыннага вытворцы абутку № 1» і названа лідарам у намінацыі «Дзіцячы абутак № 1 2008 года».

**У спорце кажуць, што стабільнасць — прыкмета майстэрства. Відавочна, што для вытворчасці гэты журналісцкі штамп таксама падыходзіць вельмі дакладна і як нішто іншае адлюстроўвае сучасны фінансава-эканамічны стан любой юрыдычнай адзінкі. А ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу — гэта тая лакмусавая паперка, па колеры якой можна вызначыць: будзе жыць «пацыент» ці не. У дачыненні да сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко», якое вось ужо амаль два дзясяткі гадоў «прапісана» ў Віцебску і ўжо працяглы час з'яўляецца заканадаўцам моды на абутковым рынку краіны, на шчасце, дадатковага дыягназу ўстанаўліваць не трэба. Прадпрыемства на працягу ўсёй прафесійнай дзейнасці вызначаецца стабільнасцю, выпускаючы шырокі асартымент высакаякаснай і даступнай прадукцыі.**

**Прадпрыемства «Марко» заснавана ў 1991 годзе як прыватная кампанія. Праўда, абутковую спецыялізацыю фірма набыла двума гадамі пазней. Вядома, што першапачатковая прафесійная дзейнасць прадпрыемства «Марко» — вытворчасць высакаякаснага абутку з натуральнай скуры на падэшве з поліурэтанавых кампазіцыйных матэрыялаў. Не дзіўна, што ўжо першыя мадэлі аб'ядналі ў сабе камфорт, зручнасць, значны тэрмін эксплуатацыі і знешнюю прывабнасць.**

**Спатрэбілася ўсяго толькі некалькі гадоў, каб у вытворчасць былі запушчаны дзіцячыя і падлеткавыя мадэлі. А калі ў 1997 годзе быў асвоены клеявы метад мацавання, мадэльныя мужчынскія і жаночыя туфлі «Марко» прыйшліся даспадобы многім моднікам і модніцам.**

**За тры пяцігодкі прафесійнай дзейнасці на абутковым рынку Беларусі і за яе межамі брэнд «Марко» заваяваў трывалыя пазіцыі. Галоўная перавага абутку «Марко» — лёгкасць, трываласць, камфортнасць, надзейнасць, гарманічны дызайн і адпаведнасць сучасным тэндэнцыям.**

**Адметна, што СТАА «Марко», нягледзячы на абмежаванасць вытворчых плошчаў і пэўныя складанасці ў прыцягненні высокакваліфікаваных кадраў, знаходзіць магчымасць пашыраць і павялічваць аб'ёмы выпускаемай прадукцыі. Апошнім захадам у дасягненні маштабнасці вытворчасці стала набыццё пакета акцый старэйшага абутковага прадпрыемства Беларусі ААТ «Чырвоны Кастрычнік» і адкрыццё каля 100 новых працоўных месцаў.**



Сённяшнія магутнасці трох абутковых прадпрыемстваў «Марко» дазваляюць выпускаць каля 3 мільёнаў 600 тысяч пар абутку ў год.

**За час работы прадпрыемствам «Марко» выпушчана каля 22 мільёнаў пар высакаякаснага абутку**

**Сёння асноўная дзейнасць кампаніі — выраб і рэалізацыя скуранога мужчынскага, жаночага, дзіцячага мадэльнага абутку, а таксама абутку спартыўнага асартыменту і для хатняга карыстання.**

**Колькасць ліній і калекцый абутку «Марко» ўражвае:**

● **«Марко-прэстыж»** — яркі, модны жаночы абутак, які вылучаецца;

● **«Марко-прэм'ер»** — абутак гэтай мужчынскай калекцыі вызначае строгасць і элегантнасць класічных формаў, высокая якасць матэрыялу.

● *Калекцыі **«Marko-sport», «Marko-boots», «San-Marko», «Home-marko»,** як паказвае час, таксама карыстаюцца павышаным попытам у пакупнікоў.*

## Кампанія «Марко — гэта своеасаблівы холдынг, у склад якога ўваходзяць шэсць прадпрыемстваў на чале з галаўным



**Абнаўляльнасць мадэльнага рада ў год складае прыкладна 90 працэнтаў. За гэты перыяд мастакі-мадэльеры распрацоўваюць звыш 1000 мадэляў, з якіх прыкладна палова запускаецца ў вытворчасць.**

## СТАА «Сан Марко»

Слова «сан» у еўрапейскіх мовах перводзіцца як «святы» ці як «сын». Відавочна, што апошні пераклад найбольш дакладна адлюстроўвае сутнасць дзейнасці даччынай фірмы, якая ўтварылася ў 2003 годзе. Як-ніяк, а тут, акрамя «дарослага» мужчынскага і жаночага абутку, выпрабляецца дзіцячы і падлеткавы асартымент. Акрамя традыцыйнай камфортнасці і бяспекі — асноўных крытэрыяў дзіцячага абутку, тут вельмі шмат увагі надаюць колеру, дэкаратыўнаму аздабленню. Нездарма на «Сан Марко» ў жарт гавораць, што прадпрыемства выпускае такі абутак, побач з якім меркне нават вясёлка.

Час паказвае, што СТАА «Сан Марко» пацвярджае статус надзейнага вытворцы запатрабаванай высакаякаснай прадукцыі. За першае паўгоддзе 2009 года рост вытворчасці на прадпрыемстве ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года склаў амаль 110 працэнтаў, ці 378 тысяч пар, аб'ём экспарту — 101,6 працэнта, ці 118,3 тысячы пар.

## Гэта цікава ведаць...

■ па статыстыцы кожны 4-ы беларус мае пару скуранога мадэльнага абутку «Марко»;

■ прадпрыемства ўкамплектавана больш чым 1 тысячай адзінак асноўнага тэхналагічнага і дапаможнага абсталявання;

■ штодзень СТАА «Марко», СТАА «Сан Марко» і ААТ «Чырвоны Кастрычнік» выпускаецца больш за 14 тысяч пар абутку;

■ усе віды абутку, выпушчаныя на СТАА «Марко», маюць сертыфікаты адпаведнасці патрабаванням Нацыянальнай сістэмы сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь і Дзяржстандарта Расійскай Федэрацыі.






*Абутак «МАРКО» ствараецца ў трывалым адзінстве перадавой тэхналогіі і асабістага прафесійнага майстэрства кожнага працуючага на прадпрыемстве. Гэтыя фотаздымкі знаёмяць з людзьмі розных прафесій, аднолькава неабходных для сучаснай вытворчасці. Вядучы мадэльер Таццяна МІКІЦІЧ і мастак-мадэльер Вольга МАРОЗАВА занятыя распрацоўкай новых вырабаў. Зборшчыку абутку Ігару КАЛАШНІКАВУ даручана працаваць са складанай робататэхнікай. Зборшчыца Ірына ГРЫШУК працуе з дзіцячым, жаночым і мужчынскім абуткам.*

## ААТ «Чырвоны Кастрычнік»

Прадпрыемства «Чырвоны Кастрычнік» — адно з найстарэйшых на абутковым рынку Рэспублікі Беларусь, якое вядзе свой вытворчы адлік з 1923 года. У канцы 80-х гадоў гэтая Віцебская абутковая фабрыка была адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў галіны з магутнасцю 7 мільёнаў пар у год.

Праўда, з 2003 па 2007 год назіраецца спад вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, што прыводзіць да стратнай дзейнасці фабрыкі. У мэтах стабілізацыі фінансава-эканамічнага становішча прадпрыемства ў чэрвені 2008 года кіраўніком дзяржавы падпісаны Указ № 324 «Аб некаторых пытаннях адкрытага акцыянернага таварыства «Чырвоны Кастрычнік», згодна з якім прадугледжваецца продаж СТАА «Марко» акцый ААТ «Чырвоны Кастрычнік», што належалі Рэспубліцы Беларусь, а таксама рэструктурызацыя запазычанасці прадпрыемства перад дзяржавай і банкам.

Прынятыя новымі спадарамі меры дазволілі ўжо ў першым паўгоддзі 2009 года выйсці на рэнтабельную работу і якасна новы ўзровень вытворчасці, значна нарасціць яе аб'ёмы.

**Сёлета тут запланавана выпусціць 750—800 тысяч пар камфортнага і недарагога абутку «эканом»-класа. У самай найбліжэйшай перспектыве — выпуск мільёна пар абутку ў год.**



## СТАА «Дзвінскі бровар»

Піваваранае прадпрыемства «Дзвінскі бровар» пачало сваю гісторыю ў 2004 годзе, калі на тэрыторыі колішняга прадпрыемства «Віцебскае піва» пачалося будаўніцтва новай вытворчасці. Годам пазней аматары пеністага напою змаглі па заслугах ацаніць піва «Нікалаеўскае». Яго галоўнае адрозненне ад іншых марак крыецца ў тым, што зварана па арыгінальнай рэцэптуры, якая на працягу многіх стагоддзяў прыносіла поспех і перавагу баварскім піваварам.

**«Дзвінскі бровар» — гэта:**

● вада з уласнай 54-метровай свідравіны, якая прайшла праз спецыяльную шматузроўневую сістэму ачысткі;

● хмель і солад, якія адпавядаюць патрабаванням нямецкіх піваварaў;

● вытворчасць пад кантролем нямецкіх піваварaў.

**З аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы — рэстаран «Залаты леў», хутаркі «Нікалаеўскія», база адпачынку «Ходцы», а таксама гандлёва-забаўляльны цэнтр «Бізнэс-цэнтр «Марко-сіці», будаўніцтва якога пачалося ў кастрычніку 2008 года і плануецца завяршыць у 2010 годзе.**

## У 2007 годзе вытворчасць прадпрыемства сертыфікавана на адпаведнасць сістэме якасці ISO-9001. Сёння «Марко» — гэта сплаў дзелавых ідэй, перадавой думкі і творчай фантазіі.

**Кампанія «Марко» працуе, зыходзячы з прынцыпу: паспяховы айчынны вытворца — апора стабільнасці беларускай эканомікі.**

**СТАА Марко» гэта:**

● уладальнік прэстыжных намінацый «Айчынны вытворца абутку № 1» у Беларусі» і «Дзіцячы абутак № 1 2008 года»;

● пераможца намінацыі «Брэнд — экспарт 2008» у Нацыянальным конкурсе «Брэнд года»;

● Лаўрэат конкурсаў «Лепшыя тавары на рынку Рэспублікі Беларусь» і «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай федэрацыі»;

● «Прэмія Урада ў галіне якасці»;

● Сертыфікацыя на адпаведнасць работы прадпрыемства міжнародным стандартам серыі СТБ ИСО 9001-2001;

## ТАА «Марко-Сэрвіс»

Калекцыя мадэляў «Марко» налічвае звыш 1000 узораў мужчынскага, жаночага, падлеткавага і дзяцячага абутку. Як разабрацца ў тым, што неабходна сёння пакупніку, як спрагназаваць попыт? Вырашыць гэтыя пытанні дапамагае фірменны гандаль.

Першая ўласная крама кампаніі «Марко» з'явілася ў 1994 годзе. Яна поўнасцю апраўдала надзеі кіраўніцтва «Марко»: штодзённыя кантакты з пакупнікамі, змяненне попыту на тую ці іншую мадэль, штодзень «жывыя» грошы, якія ідуць на развіццё вытворчасці. Дзякуючы гэтым фактарам вытворчасць абутку на прадпрыемстве «Марко» набыло неабходную гнуткасць, фінансавую ўстойлівасць , а самае галоўнае — высокую папулярнасць сярод пакупнікоў. Развіваць брэнд «Марко» на «людзях» было даручана новаму прадпрыемству «Марко-Сэрвіс», якое ўжо паспяхова праіснавала амаль паўтара дзясятка гадоў. Зараз ТАА «Марко-Сэрвіс» уключае ў сябе 25 фірменных крамаў і здзяйсняе транспартнае абслугоўванне прадпрыемстваў «Марко».

За 2008 год праз фірменную гандлёвую сетку рэалізавана амаль 684 тысячы пар абутку. Аўтапарк ТАА «Марко-Сэрвіс» налічвае 36 грузавых і легкавых аўтамабіляў.

Крамы СТАА «Марко» размешчаны ва ўсіх абласных і буйных раённых гарадах Беларусі. Толькі ў сталіцы іх чатыры, якія адкрыліся крыху больш чым за год.





*У фірменнай краме вас ветліва сустрэнуць прадаўцы Вольга АЗАРОНАК і Вольга СТАРЫКОВІЧ. Сярод мноства прывабных мадэляў для дзятвы асаблівую ўвагу прыцягвае абутак, па-мастацку ўпрыгожаны рознакаляровым вышываным малюнкам.*

**Фірменны гандаль СТАА «Марко» — не толькі гонар прадпрыемства, але і неад'емная частка бізнэсу.**

## Фірменныя крамы СТАА «Марко»:

**г. Віцебск**

● Гандлёвы Дом «Марко-Стыль», вул.Талстога, 5, тэл. (+375-212)-37-63-80

● Гандлёвы Дом «Марко», вул.Чарняхоўскага, 10, тэл. (+375-212)-22-78-00

● цэнтр абутку «Марко», пр-т Люднікава, 16, тэл.(+375-212)-24-09-70

● магазін-салон «Марко», пр-т Маскоўскі, 8, тэл.(+375-212)-27-71-42

● павільён «Марко», тэл. (+375-212)-36-58-21

**г. Мінск**

● вул. Казлова, тэл.(+375-17)-2-849-154

● вул. Кашавога, 35, тэл. (+375-17)-2-307-303

● вул. Чкалава, 35. тэл. (+375-17)-2-190-297

● пр-т Незалежнасці, 43, тэл. (+375-17)-2-847-992

**г. Бабруйск**

● вул. Мінская, 15, тэл.(+375-17)-58-03-91

● вул. Савецкая, 82, тэл.: (+375 225) 52-53-26

**г .Полацк**

● вул. Камуністычная, 28, тэл.(+375-2144)-4-56-66

**г. Наваполацк**

● вул. Маладзёжная, 71, тэл. (+3752145)-3-24-88

**г. Брэст**

● пр-т Маскоўскі, 332, тэл. (+375-162)-42-45-01

● пр-т Машэрава, 39, тэл. (+375-162)-20-30-05

**г. Гомель**

● вул. Перамогі, тэл.(+375-232)-77-63-66

**г. Жлобін**

● Мікраён-1, 1, тэл.(+375-2334)-5-07-91

**г. Магілёў**

● вул. Ціміразеўская, 36, тэл.(+375-222)-32-75-95

● вул. Першамайская, 40, тэл.(+375-222)-28-74-90

**г. Маладзечна**

● вул. Б. Хмяльніцкага, 22А. Тэл.(+375-1773)-5-35-97

**г. Орша**

● вул. Леніна, 23, тэл.(+375-2162)-1-16-42

**г. Светлагорск**

● м-н Першамайскі, 3А, тэл. (+375-2342)-2-31-33

**г. Салігорск**

● вул. Казлова, 26А, тэл. (+375-1710)-5-05-26

**г. Баранавічы**

● вул. Савецкая, 105А, тэл. (+375-0163)-41-03-84).



*Зборшчыкі Святлана МАРКОВІЧ і Віктар КАРНІЛАЎ працуюць на розных участках, але калі на канвееры абутак пачынае набываць сваю форму, намаганні кожнага аб'ядноўваюцца ў канчатковым вырабе — элегантным і практычным абутку «МАРКО».*

## Прыватнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства «ВІТМА»

**Вядома, што модны стыль стварае не толькі добры модны абутак, але і спадарожнікі-аксесуары. Не дзіўна, што на «Марко» была звернута ўвага на скургалантарэйныя вырабы. Усё пачыналася ў 1996 годзе. На прадпрыемстве «ВІТМА» пачалі перапрацоўваць адходы асноўнай абутковай вытворчасці і шыць з іх партаманеты, футляры для ачкоў, ключоў, мабільных тэлефонаў і іншую дробязь.**

Важным этапам развіцця дачынага прадпрыемства стаў выраб скураных сумак. За аснову вытворчасці былі ўзяты апошнія італьянскія тэхналогіі. А каб задаволіць патрэбы асноўнай вытворчасці ў камплектавых частках, на прадпрыемстве «ВІТМА» была ўведзена лінія пашыву загатовак верху абутку.

**Сёння ПУВП «Вітма» гэта:**

• вытворчасць 20 найменняў асартыменту скургалантарэйных вырабаў, у тым ліку і модных эксклюзіўных сумачак;

• высокатэхналагічная вытворчасць загатовак для верху абутку з натуральнай скуры;

• укараненне інавацыйных распрацовак вучоных Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта;

• штогадовая вытворчасць каля 40 тысяч скургалантарэйных вырабаў і 210 тысяч загатовак абутку;

• уласная дызайнерская база, дзякуючы якой штогод распрацоўваецца больш за 200 новых мадэляў;

• сертыфікаваная сістэма менеджменту якасці, якая адпавядае патрабаванням СТБ ИСО 9001-2001.

**За 18 гадоў работы СТАА «Марко» інвеставала ў развіццё сваіх прадпрыемстваў і аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы каля 40 мільёнаў долараў.**



*Жаночыя сумачкі да любой сукенкі дапаможа вам падабраць прадавец фірменнай крамы Натальля ФІЛАТАВА.*

editorial ofice

trade leaders' club



*Майстра Мікалая ЖУРАЎЛЁВА і зборшчыка Аляксандра КАЗЛОВА фотааб'ектыў убачыў каля агрэгата для ліцця (на здымку злева), зацяжчыка Аляксандра КРАМІНСКАГА (на здымку справа) — побач з яго складаным паўаўтаматычным станком. На здымку ў цэнтры — апрацоўшчык абутку Сяргей КАЛІНІН.*

**Кампанія «Марко» — буйны экспарцёр беларускай прадукцыі. Штогод за межы краіны пастаўляецца звыш 50 працэнтаў выробленага абутку. Асноўны замежны рынак — Расійская Федэрацыя.**

**ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА!**

**Нашы рэквізіты**

Рэспубліка Беларусь, 210033, г. Віцебск, пр-т Фрунзе, д. 85
Тэл.: (+375 212) 24-58-54, 24-86-18
Факс: (+375 212) 24-97-63
E-mail: post@marko.vitebsk.by
УНП 300237279

Матэрыялы рэкламна-інфармацыйнай старонкі падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.

## Мікалай МАРТЫНАЎ, генеральны дырэктар СТАА «Марко»:

# «БІЗНЭС — ГЭТА РЫЗЫКА І Ў МНОГІМ ФАРТУНА»

**БЕЗ сумненняў, што сусветны эканамічны крызіс спарадзіў у радах айчынных прадпрымальнікаў, бізнэсменаў і людзей з камерцыйнай жылкай нямала сумненняў наконт іх далейшага лёсу. Што зусім не дзіўна, бо спадарожнікамі сапраўднага бізнэсу сталі змяншэнне плацежаздольнасці кліентаў, больш жорсткія ўмовы работы з банкаўскімі структурамі, змяншэнне колькасці дзелавых партнёраў, якія маглі б на высокім прафесійным узроўні весці справу і яшчэ шмат якіх «але».**

Між тым такія эканамічныя ўзрушэнні макрамаштабу для многіх з людзей ад бізнэсу з'яўляюцца сапраўднай праверкай на іх трываласць і здольнасць супрацьстаяць фарс-мажорным абставінам у лепшых традыцыях выжывання. Сярод такіх глыб, якія застаюцца плаваць у вірлівым акіяне праблем, можна лічыць кіраўніка сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко» Мікалая Мартынава, які ўжо больш за паўтара дзясятка гадоў паспяхова вядзе абутковы бізнэс ў Віцебску, узначальваючы прадпрыемства «Марко».



Можна не сумнявацца, што ў коле бізнэсменаў у Мікалая Васільевіча нямала такіх, якія зайздросцяць яму не толькі па-добраму. Як-ніяк, а менталітэт некаторых людзей складзены па малазразумелых прынцыпах, калі ім спіцца не спакойна, што ў суседа справа ідзе належным чынам, нягледзячы ні на што. Хоць, будзем шчырымі, большасць калег-прадпрымальнікаў, і не абавязкова шахматыстаў, палічаць спадара Мартынава ферзём. І будуць мець рацыю. Бо нават і без крызісу планетарнага ўзроўню знойдзецца няшмат людзей, якія здольны горы звярнуць, пратаптаць сабе дарогу на Алімп, адолеўшы неверагодныя цяжкасці, загартаваўшыся на ўсе выпадкі жыцця. Адсюль напрошваецца выснова: феномен паспяховасці Мікалая Мартынава закладзены ў ім самім. На Захадзе гэта мілагучна называецца Self made man. У нашай «транскрыпцыі» — чалавек, які зрабіў сябе сам.

***Хто ж гэта за чалавек Мікалай Мартынаў? Сёння карэспандэнт «Звязды» знаёміць з ім сваіх чытачоў.***

***— Мікалай Васільевіч, гэты год для прадпрыемства «Марко», як і ўсёй айчыннай эканоміці, асаблівы: супрацьстаяць сусветнаму эканамічнаму крызісу.***

— Сапраўды, гэта так. Хоць кожнаму з нас не варта прыкрывацца гэтымі абставінамі. Па-першае, ад гэтага нічога не зменіцца. Па-другое, усё адно трэба працаваць, бо жыццё не стаіць на месцы. Увогуле, калі сапраўдным бізнэсменам было лёгка? Пра пачатак любой справы і казаць няма чаго: перашкоды і шышкі на кожным кроку. Зарабіў грошы — думай, як правільна іх укласці ў далейшае развіццё. Нарэшце ты дабіўся многа, але хочацца болей. Таксама галава баліць, як захаваць лідарства і г.д. Так што крызіс — гэта паняцце адноснае. Гэта своеасаблівая праверка на трываласць. Хоць, вядома ж, пэўную долю адмоўных пасылаў ён нясе.

***— Вы згодны з тым меркаваннем, што зараз цяпер той час, калі можна на ўнутраным рынку прасунуць менавіта айчынную прадукцыю?***

— У чымсьці можна з вамі пагадзіцца. Прагнозы аналітыкаў збываюцца: у няпростыя часы пакупнік аддае перавагу айчынным таварам. І тлумачыцца гэта проста: прадукцыя беларускіх вытворцаў бліжэйшая і раднейшая. Да таго ж беларускія часта пераўзыходзяць імпартныя аналагі па якасці, намнога спрашчаюцца пытанні, звязаныя з гарантыйным абслугоўваннем. Ды і цана цяпер адыгрывае далёка не апошнюю ролю. Пакупнікі сочаць за сваімі расходамі і стараюцца не эксперыментаваць, выбіраючы гандлёвыя маркі, правераныя часам. Праўда, пагадзіцеся, што ніякія абставіны не прымусяць народ купляць няякасны ці нязручны ў карыстанні тавар з надпісам «Зроблена ў Беларусі», няхай нават вельмі танны. Таму якасць — перш за ўсё. У дачыненні да абутку — гэта яшчэ і адпаведнасць модзе, камфорт, цана.

***— Цяпер можна сказаць, што цікавасць беларускага спажыўца да абутку «Марко» расце?***

— Скажу інакш — працягвае няўхільна расці. Пацвярджэннем таму можна лічыць вытворчыя паказчыкі за першае паўгоддзе, калі назіраецца рост вытворчасці на ўсіх трох абутковых прадпрыемствах і рэалізацыі ў сетцы продажаў. У лічбах гэта складае 1 мільён 543 тысячы пар. Прырост вытворчасці ў натуральным выражэнні склаў 187 тысяч пар, ці 13,8 працэнта, у той час гэты ж паказчык па канцэрне «Беллегпрам» склаў 37 тысяч пар і 0,8 працэнта адпаведна. Прабачце за такую «арыфметыку», але ж эфектыўнасць вытворчасці без лічбаў — пустая размова.

***— Вяртаюся ў сённяшні дзень, як вы ацэньваеце сённяшні абутковы рынак Беларусі і якая доля кампаніі «Марко» на ім?***

— Зараз у Беларусі 37 працэнтаў абутку выпускаецца пад брэндам «Марко». Увогуле, я лічу, што абутковы рынак у нас ужо дастаткова сфарміраваны, ён са сваімі законамі і правіламі гульні. Тым не менш гэта зусім не значыць, што сюды нельга прыйсці з нейкімі арыгінальнымі задумкамі, якія можна ўдала ўвасобіць у жыццё.

***— Мікалай Васільевіч, сёння, бадай, кожны школьнік ведае закон эканомікі: вырабіць тавар — гэта паўсправы. Трэба ўмець яго з поспехам прадаць.***

— Безумоўна, што гэта так. Мне прыемна адзначыць, што сёння абутак з гандлёвай маркай «Марко» дасягнуў такой папулярнасці, што прапановы апераджаюць попыт, і мы вымушаны наладжваць вытворчы працэс ў некалькі змен і нават у выхадныя дні. Зразумела, што на такі пік мы выйшлі не з першага года дзейнасці. Удзел у розных выставах, у тым ліку міжнародных, правядзенне разнастайных маркетынгавых даследаванняў, аналіз прапановы і попыту на прыкладзе работы фірменных крамаў, уніфікацыя, гібкасць і аператыўнасць у асваенні новых мадэляў абутку. Пры гэтым пастаянны кантроль якасці, дасягненне максімальнага камфорту і дастунасці для пакупніка любога дастатку.

***— Зараз якраз можна закрануць тэму экспарту. Традыцыйна, беларускія вытворцы трымаюць курс на Расію, дзе лепш за ўсё можна рэалізаваць сваю прадукцыю.***

— Думаю, што мы не выключэнне з правілаў. Галоўны экспартны рынак абутку «Марко» — гэта, безумоўна, Расія, а калі быць больш дакладным — то Масква, бо менавіта ў белакаменнай сцякаюцца ўсе фінансавыя патокі, адзін з якіх можна скіраваць і ў свой бок. Хоць, скажу вам шчыра, расійскі бізнэс і беларускі — гэта дзве вялікія розніцы. Масква можа ўвесь тавар з выгадай для сябе праглынуць, так і не прыняць, нягледзячы нават на высокую якасць тавару. Хоць сёлета, лічыце, палову выробленай прадукцыі адправілі ў Расію. Пры гэтым рост продажаў у братэрскую краіну склаў 111 працэнтаў.

***— Самы час паганарыцца такімі дасягненнямі: на дварэ крызіс, а ў нас — толькі яго звон...***

— Зорная хвароба не для нас. Да таго ж можа здарыцца так, што сёння ты адчуваеш сябе шчаслівым, на сёмым небе ад радасці, а заўтра можа быць сумны настрой. У любым бізнэсе гэта як закон. Таму для сябе ўжо даўно ўзяў за правіла: калі хочаш працаваць з поспехам надалей — замілоўвацца сённяшнімі вытворчымі поспехамі ці красавацца перад люстэркам з надзьмутымі шчокамі нельга. Магчыма, я крышку згусціў фарбы, але ж гэта чысцей.

***— Што вы ставіце на першы план у бізнэсе?***

— Думаю, што не буду арыгінальным, калі адкажу, што сумленнасць, адказнасць і прыстойнасць. Кіруючы дробнай фірмай ці буйным прадпрыемствам, трэба ўмець браць на сябе вялікія абавязацельствы, адказваючы за паспяховасць і стабільнасць работы калектыву, арганізоўваючы камфортныя ўмовы працы і забяспечваючы дастойную зарплату. А для таго, каб гэтыя абавязацельствы выконваць, трэба самому быць сумленным і адказным.

***— Мікалай Васільевіч, сёння як ніколі можна назваць вас паспяховым чалавекам ў бізнэсе. Праўда, так можна меркаваць толькі з пазіцыі дылетанта, бо за пладамі карпатлівай шматгадовай работы неяк убаку застаецца такая рыса, як рызыка. Вы чалавек рызыкоўны?***

— Не я гэта прыдумаў, што той, хто не рызыкуе — не п'е шампанскае. Па жыцці вельмі шмат даводзілася і даводзіцца цяпер рызыкаваць. Ды што там казаць: бізнэс — гэта таксама рызыка, у многім фартуна. Ды і проста ў жыцці прыходзілася нешта ставіць на вагі і казаць сабе: калі не рызыкну — не бачыць мне ўдачы. Праўда, рызыка таксама павінна быць разумнай.

***— Гэта вы пра далучэнне да прадпрыемства «Марко» фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» і будаўніцтва ў Віцебску гандлёва-забаўляльнага комплексу?***

— Магчыма, хоць на ўсё ёсць свае прычыны. Напрыклад, набыццё пакета дзяржаўных акцый «Чырвоны Кастрычнік» — гэта звычайная вытворчая неабходнасць. Дзякуй Прэзідэнту краіны Аляксандру Лукашэнку за садзейнічанне ў вырашэнні гэтага пытання. Не ведаю, як бы мы выкручваліся без Указа № 324, бо на чэрвень 2008 года мы фактычна загрузілі вытворчыя плошчы на галаўным прадпрыемстве «Марко» і даччыным «Сан Марко» на 100 працэнтаў. А як у такой сітуацыі расці, павялічваць аб'ёмы? Будаваць новыя вытворчыя карпусы. Навошта такія затраты, калі побач знаходзілася страшнае прадпрыемства са свабоднымі вытворчымі плошчамі.

Мяркую, што такое «зліццё» — на карысць абодвум бакам. Зараз на «Чырвоным Кастрычніку» людзі пачалі атрымоўваць дастойную зарплату, было адкрыта дадаткова каля сотні новых працоўных месцаў. Увогуле, прадпрыемства выйшла на рэнтабельную работу менш чым за паўгода. На яе плошчах кампанія «Марко» атрымала магчымасць развіваць вытворчасць абутку «эканом»-класа, які можна аднесці да разраду дэфіцытнага з-за яго камфортнасці і таннасці. За першыя 6 месяцаў з канвеера «Чырвонага Кастрычніка» сышло 227 тысяч пар абутку. У нашых найбліжэйшых планах — павелічэнне абёму выпуску і да канца гэтага года вырабіць 750—800 тысяч пар, а ў 2010 годзе — больш за мільён.

***— Трэба меркаваць, што будаўніцтва гандлёва-забаўляльнага комплексу, якое пачыналася да сусветнага эканамічнага крызісу, таксама эканамічна апраўдана?***

— Тут некалькі іншая сітуацыя. Як-ніяк, а гэты комплекс з карыснай плошчай у 45 000 квадратных метраў, які будзе ўяўляць васьміўзроўневы будынак з падземным двухузроўневым паркінгам — не месца для вытворчасці абутку ці скураных сумак і аксесуараў. Тым не менш з'яўленне на галоўнай вуліцы абласнога цэнтра сучаснага па стылі архітэктурнага ансамбля, рэалізаванага з прымяненнем самых сучасных тэхналогій і матэрыялаў, будзе з'яўляцца яшчэ адной візітнай карткай Віцебска, здольнага ўпрыгожыць яго, як культурную сталіцу.

***— Мікалай Васільевіч, вашаму аптымізму можна толькі пазайздросціць. І вельмі прыемна гэта зрабіць сёння ў ваш чарговы дзень нараджэння. Скажыце, як адчувае сябе мужчына ў 50 гадоў з хвосцікам на ўласным прыкладзе?***

— У такіх выпадках звычайна ў жарт кажуць: не дачакаецеся. Ну, а калі сур'ёзна, то нармальна. Аптымістычна, бадзёра, спакойна. Колькі табе адмерана ў гэтым жыцці — значыць, столькі і пражывеш. Іншая рэч — як ты гэта зробіш?

***— Вы падводзіце да той думкі, што кожны — каваль свайго шчасця.***

— Безумоўна. Няхай табе будзе 40, 50 ці болей гадоў. Калі ў душы пуста, то малаверагодна, што для цябе гэтыя лічбы адыграюць вялікую ролю. Галоўнае, на мой погляд, — гэта ўнутраны стан чалавека. Хоць, чаго хаваць, кожнаму чалавеку, асабліва жыццёва актыўнаму, хочацца заўсёды быць маладзейшым. Тым не менш паўтаруся: мая жыццёвая філасофія — быць маладым душой. А цела падтрымліваць у належнай форме праз актыўны вобраз жыцця.

***— Якому віду спорту вы аддаяце перавагу?***

— Апошнім часам я шмат хаджу пешшу. Звычайна раз на тыдзень гуляю ў валейбол, наведваю лазню, дзе абавязкова плаваю ў басейне. Адчуваю сябе ў добрай форме, не звяртаючы асаблівай увагі на гады.

***— Як прафесіянал, скажыце, а ўвагу на абутак вашых кліентаў, партнёраў, звычайных людзей на вуліцы вы звяртаеце?***

— Не я ж прыдумаў, што «по одёжке встречают». Што датычыцца чаравікаў, напрыклад, дзелавога чалавека, то тут магу казаць шмат... Абутак — гэта візітная картка кожнага з нас. Ён расказвае аб сваім гаспадары шмат цікавага, адлюстроўвае яго светаўспрыманне, сацыяльны статус, дабрабыт, род занятказ. Схільнасць да класічнай, традыцыйна камфортнай ці, наадварот, прыналежнасць да эксцэнтрычнага абутку дае нам поўнае ўяўленне аб унутраным свеце яго ўладальніка. Акрамя ўсяго іншага, добра абуцца — гэта значыць належным чынам падкрэсліць сваю індывідуальнасць, прадэманстраваць пачуццё стылю ў схільнасці да самых модных тэндэнцый.

Калі коратка, то для сучаснага дзелавога чалавека кампанія «Марко» прапаноўвае багаты выбар для фарміравання ўласнага іміджу і раскрыцця самых разнастайных талентаў. Так што выбар за вамі, шаноўнае спадарства!

**Гутарыў Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**
*Мінск—Віцебск—Мінск.*

## ПАДАРАЖЭЛІ 12 НАЙМЕННЯЎ ЦЫГАРЭТ

**З учарашняга дня павышаныя рознічныя цэны на 12 з 25 найменняў уласных марак цыгарэт, што вырабляюцца ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».**

Паводле звестак Міністэрства эканомікі, рознічныя цэны на гэтыя цыгарэты выраслі ад 1,7 да 18,2 працэнта, ці ў сярэднім на 4,1 працэнта. Як адзначаюць у міністэрстве, такое рашэнне прынятае ў сувязі з павышэннем стаўкі акцызу, з улікам падаражэння кошту імпартнай сыравіны і матэрыялаў. Акрамя таго, улічыўшы сітуацыю на тытунёвым рынку, пастановай Мінэканомікі прадугледжваецца зніжэнне раней зацверджанага ўзроўню рознічных цэнаў на цыгарэты «Monte Carlo Superslims» з 2200 да 2000 рублёў за пачак.

**Ігар ГРЫШЫН.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов республиканской собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с установлением начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством

| | Не завершенные строительством объекты | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Наименование предмета аукциона** | **Здание блока цехов и право заключения договора аренды земельного участка** | **Здание инженерного корпуса и право заключения договора аренды земельного участка** | **Здание бытового корпуса со столовой и право заключения договора аренды земельного участка** | **Здание центральной заводской лаборатории и право заключения договора аренды земельного участка** | **Железнодорожный подъездной путь и право заключения договора аренды земельного участка** |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Брестская обл., г. Дрогичин, ул. Ленина, 204 | | | | |
| **Продавец недвижимого имущества** | РУПП «Экзон-Глюкоза», г. Дрогичин, ул. Ленина, 204, тел. 01644 3 10 25, 3 00 84 | | | | |
| **Сведения о предмете аукциона** | Здание блока цехов - степень готовности 55 %. Земельный участок площадью 3,5915 га, срок аренды – 25 лет | Здание инженерного корпуса – степень готовности 55 %. Земельный участок площадью 1,1671 га, срок аренды – 25 лет | Здание бытового корпуса со столовой – степень готовности – 55 %. Земельный участок площадью 1,0089 га, срок аренды – 25 лет | Здание центральной заводской лаборатории – степень готовности 50 %. Земельный участок площадью 0,9081 га, срок аренды – 25 лет. | Ж/д подъездной путь – длина 2,1 км, ширина- 1,51 м. Земельный участок площадью 2,5513 га, ограничения в охранных зонах линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений, срок аренды – 25 лет. |
| **Условия аукциона** | -использование объекта для осуществления предпринимательской деятельности;<br>- создание и регистрация на территории Дрогичинского района юридического лица;<br>- создание не менее 20 новых рабочих мест в 2009 году;<br>- при организации производства, требующего соблюдения санитарной зоны, обеспечение выноса действующих складов РУПП «Экзон-Глюкоза» и РУП «Экзон» за пределы производства;<br>- запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи | - использование объекта для предпринимательской деятельности, создание не менее 3 новых рабочих мест в 2009-2010 гг.;<br>- запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи. | | | |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 37 072 253* | 12 070 689* | 10 439 256* | 9 399 758* | 19 466 753* |
| **Сумма задатка, руб.** | 3 700 000 | 1 200 000 | 1 040 000 | 900 000 | 1 940 000 |
| **Организатор аукциона** | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 0162 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63. www.brest-region.by** | | | | |

** определена как сумма начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством, и начальной цены продажи права заключения договора аренды земельного участка. В случае изменения на дату проведения аукциона размера базовой величины начальная цена предмета аукциона корректируется с учетом изменения размера базовой величины.*

Аукцион состоится **1 сентября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. **К участию в аукционных торгах допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие следующие документы:**

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 31.08.2009 г. включительно;

негосударственным юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

негосударственным иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до таты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество»
с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 31 августа 2009 года включительно.**


Нефармат

# Сашчапіць атам і зачыніць інтэрнэт,

## або Колькі мегабайт распусты?

**Калі б Марыя Кюры магла ўявіць, чым будзе пагражаць чалавецтву яе геніяльнае адкрыццё, каб ёй паказалі Хірасіму, яна, я думаю, нікому б не сказала, што расшчапіла атам. Схавала б свае разлікі і сышла ў манастыр. Але яна была ўпэўнена, што адкрыццё паслужыць прагрэсіўнаму чалавецтву і забяспечыць тэхнічны прарыў. Так і стваральнікі сусветнага павуціння лічылі, што ашчаслівілі ўвесь люд, аб'яднаўшы яго ў адзіную інфармацыйную прастору. І быў інтэрнэт напачатку цудам — крыніцай ведаў, сродкам стасункаў, зручнасцю ў рабоце, пакуль не стаў разам з пералічаным усяленскай выграбной ямай, куды зліваецца ўся брыдота, назапашаная чалавецтвам.**

Каляжанка заклапацілася падрыхтоўкай дачок да новага навучальнага года і набрала ў «Пошуку» словазлучэнне «школьная форма», у адказ ёй палезлі карцінкі адна за другую выразней. Толькі целы на іх былі зусім без якой-небудзь формы. З агідай шчоўкнуўшы мышшу і выказаўшыся з нагоды, яна выйшла з інтэрнэту.

Цяпер гэта стала нормай: толькі зайдзі ў павуціну, цябе заклікаюць, спакушаюць, прываблiваюць завітаць на спецыфічныя сайты. Нават не трэба задаваць параметры пошуку, накшталт «толькі для дарослых», — чорт ведае што можна сустрэць і пры больш цнатлівых спасылках.

Недаросткі навучыліся карыстацца інтэрнэтам і «прыколваюцца» на ўсе лады. Для сваіх цёмных справаў выкарыстоўваюць нават шыльды рэальна існуючых ці былых устаноў. Так, пры падрыхтоўцы гэтага матэрыялу на сайце «Лесбіянкі» зацікавілася надпісам: «Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 2 лёгкай прамысловасці». На першы погляд, нічога незвычайнага: раздзелы: парады студэнтам, калонка сацыяльнага педагога і ... «галоўная ідэалагічная старонка альбо гасцявая кніга» — так стваральнікі назвалі свае парнаграфічныя практыкаванні. А там — чаго хочаш. Але прыведзены вышэй прыклад выглядае бязвіннай забаўкай у параўнанні з маштабамі дзіцячай парнаграфіі, садызму, расізму ў Сусветнай павуціне. Галоўнае, што ўсё гэта даступна карыстальніку любога ўзросту.

Ва ўсім свеце перыядычна раздаюцца пратэсты псіхолагаў і псіхіятраў, педагогаў, святароў, якія патрабуюць адгарадзіць маладое пакаленне ад уплыву таго, што разбурае псіхіку. Але пакуль гучаць тыя нясмелыя і нястройныя пратэсты, з розных канцоў свету паступаюць інфармацыйныя паведамленні: школьнік расстраляў з аўтамата сваіх аднакласнікаў (для Амерыкі і Еўропы амаль прывычная карціна), у адным з расійскіх гарадоў дзесяцігадовы хлопчык некалькі разоў ударыў нажом бабулю, якая забараніла доўга гуляць у «стралялкі».

Не так даўно адзін з шаноўных нашых святароў прапанаваў наогул інтэрнэт зачыніць для карыстання. Інфармагенцтвы паведамілі пра ініцыятыву міністра па справах сям'і ФРГ стварыць адзіны кодэкс паводзінаў у інтэрнэце. Як нельга злавіць Джына, што выскачыў з бутэлькі, так і не спыніш інтэрнэт, якім карыстаецца звыш мільярда чалавек у свеце. Ніхто не будзе знішчаць аўтатранспарт з-за таго, што кожны год шмат людзей гіне на дарогах. Ды і кодэкс паводзінаў, як і кодэкс гонару, будзе захоўваць, відаць, толькі той, хто гонар мае. Заклікаць да маральнасці ў інтэрнэце людзей амаральных, па-мойму, тое ж самае, што заклікаць шчупака карыстацца мостам цераз раку. Тут жа неабмежаваныя магчымасці даць волю сваім ганебным інстынктам, заганам і распусце. І хай бы цешыліся заганныя асобы сваім віртуальным адлюстраваннем, можа, нацешыўшыся, менейуласнай унутранай брыдоты выносілі б у рэальны свет. Але ж як адгарадзіць дзяцей і падлеткаў? Ім жа больш цікава якраз тое, што забаронена. Суседка аднойчы застала дзяцей-школьнікаў за праглядам такой карцінкі: размаляваная дзяўчына, не зусім без адзення, але на высачэзных абцасах-цвіках ідзе і з радасным смехам душыць гэтымі каблукамі малых жоўценькіх куранят. З няшчасных птушанят пырскае кроў, вылазяць кішкі, а яна шчаслiва рагоча... Суседка крычала на ўсю пляцоўку, што выкіне камп'ютар з восьмага паверха, паб'е яго і патрушчыць. Пазней, крыху супакоіўшыся, яна гаварыла, што вось такім чынам трэба душыць стваральнікаў падобных сайтаў. Толькі як іх задушыш? Аднаго пасадзяць у турму, на яго месца заступае дзясятак, бо такога роду дзейнасць забяспечвае звышпрыбытак.

Але з гэтым нешта трэба рабіць. Калі ўспомніць запавет Антуана дэ Сент Экзюперы наконт адказнасці за таго, каго прыручыў, то можна зрабіць выснову аб адказнасці спецыялістаў з галіны высокіх тэхналогій. Калі ёсць у свеце геніяльныя хакеры, якія могуць узламаць любую абарону сістэмы, то чаму б не ўявіць сабе, што яны могуць стварыць геніяльнага віруса-санітара, які гуляў бы па інтэрнэце і знішчаў усялякага кшталту брыдоту, а сам быў бы незнішчальны. Толькі не варта скупіцца чалавецтву на ўзнагароду за такое вынаходніцтва. Для гэтага краіны, зацікаўленыя ў чыстцы інфармацыйнай прасторы, маглі б і скінуцца. Была б яшчэ адна нагода сустрэцца кіраўнікам дзяржаў і дэманстраваць перад камерамі свае светлыя намеры на дружбу і супрацоўніцтва.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Погляд

# АД ВАРАЖБЫ ДА ЖУРБЫ,

## альбо Ці варта разгадваць будучыню?

Людзі любяць таямніцы. Але ўсе таямніцы маюць пад сабой нейкую прыроду, першапрычыну: у цёмным бяздонным небе, ці ў глыбіні вякоў ды пад покрывам часоў, захаваныя нібыта клады пад зямлёй. Дакапацца, знайсці скарб, адкрыць завесу часу, пазбавіўшы сябе на будучыню ад непрыемнясцяў, нечаканасцяў, і іншых падобных «не». Не, без варажбіткі тут не абысціся... І шмат хто ў наш прасунуты, матэрыялістычны, навуковы час узгадвае пра іх. А некаторыя шукаюць — і знаходзяць. Нават цяжка ўявіць, што гэта можа быць так проста.

Тым больш што не так даўно ў закон аб рэкламе была ўнесена папраўка, якая забараняла рэкламу прац, паслуг, альбо дзейнасці гіпнатызёраў, экстрасэнсаў, варажбітак, спірытаў, астролагаў, калдуноў, аракулаў... Можна працягваць называць імёны розных магаў, якія прыбягаюць да нейкай невядомай сілы, што дапамагае ім прадказваць падзеі, уплываць на людзей і асяроддзе. Іх шмат — было і засталося нягледзячы на змяненні ў законе нашай краіны. Пра гэта папярэджваюць асобы, якія разгадалі гульню «таямнічых вешчуноў» ў хованкі з законам.

### ІМЯ ЛЕГІЁН

— Памятаеце, як выглядала рэклама акультыстаў некалькі гадоў таму? Дык вось гэтыя цэнтры, як правіла, захавалі свае назвы, але калі раней у рэкламе прама гаварылася, чым яны займаюцца (прыварожым, адварожым, сурокі), то цяпер даецца проста назва і тэлефоны, — звяртае ўвагу **адказны сакратар грамадскага савета па маралі Андрэй АЛЕЖКА**. — Рэклама падаецца ў тым жа знешнім выглядзе, у якім яна ішла. І ўсім зразумела, пра што ідзе гаворка. Праўда, быў момант, калі яны ўсе ў адзін момант сталі псіхолагамі. Потым — проста прапануюць стасункі, дапамогу, незразумела якую. Яны здолелі абысці нават гэтую норму закона аб рэкламе. Застаецца пытанне: якім чынам не дапусціць насмешкі над законам, калі механізм ёсць, але нешта дазваляе заставацца акультнай рэкламе.

Безумоўна, сам феномен цікавасці да акультызму ўзнік не сёння. Гэта вынік духоўных «белых плям», якія патрапілі на цэлыя пакаленні вызваленых ад веры людзей. Але душа па прыродзе сваёй цягнецца да вышэйшага, да спасціжэння ісціны існавання. І калі замест татальнай забароны веры ўзнікла татальная свабода, шмат якія людзі сталі ахвярамі сваёй неадукаванасці.

Яны шукалі нечага звышнатуральнага, а знайшлі...

### СЕАНСЫ АРАКУЛАЎ

**Аляксандр ШЫМБАЛЁЎ, святар аддзела адукацыі Мінскай епархіі, загадчык кафедры педагагічнага ўніверсітэта**, мае тлумачэнне, чым прыцягваюць розныя магі:

— Для пачатку трэба задацца пытаннем: ці сапраўды нясуць праўду нейкі астралагічны прагноз або інфармацыя, якая атрымана ў выніку гадання на картах таро ці нечага падобнага? Мае гэта навуковае абгрунтаванне, духоўную карысць? І што людзям патрэбна: праўда або яны гатовыя падманвацца за грошы? Вучоныя шматлікіх краін свету — ЗША, Францыі, Германіі, і ў Расіі, і ў нашай краіне даследавалі астралагічныя прагнозы. Высветлілася, што ніякай праўды яны не нясуць у прынцыпе.

Англічане правялі цікавае даследаванне, у якім паказалі, што калі б мы проста ўгадвалі, не звяртаючыся па дапамогу да астролагаў, то верагоднасць пападання была б вышэйшая, чым у астралагічным прагнозе. Астралогію нельга разглядаць як навуку. Прыклад: мы ведаем, што ёсць планета Плутон, яна да нядаўняга часу не лічылася астраномамі паўнавартаснай планетай Сонечнай сістэмы — напачатку няправільна ацанілі яе памеры, масу. Сёння яе перавялі ў разрад карлікавых планет, прызнаўшы, што яна не дацягвае да вялікай планеты. Але астролагі яе выкарыстоўваюць у сваіх прагнозах нароўні з вялікімі планетамі. Цікава тое, што планета Плутон была адкрыта ў 1930 годзе. Перыяд звароту яе вакол сонца 248 гадоў. Значыць, з 1930 года мы назіраем гэтую планету на небе ўсяго 79 гадоў, каля трэці яе перыяду. Гэта значыць, што калі б астролагі займаліся навуковай дзейнасцю, яны б змаглі апісаць становішча гэтай планеты ў чатырох знаках задыяка. Гэта толькі трэць задыяка. А ў астралагічных даведніках апісана, што яна азначае, калі знаходзіцца ва ўсіх 12 знаках задыяка. Атрымліваецца, што ў большасці знакаў яна ўвогуле не назіралася... Адкуль астролагі бяруць усю гэтую інфармацыю? Кажуць, маўляў, трэба ўмець падключыцца да нейкага энерга-інфармацыйнага поля, і адтуль гэтую інфармацыю ўзяць. Тут мы маем справу альбо з яўным вымыслам, альбо яны сапраўды праводзяць нейкі спірытычны сеанс, у выніку якога атрымліваюць інфармацыю. І тут мы падыходзім да таго, што астралогія вельмі часта насаджае акультны светапогляд у грамадстве, схіляе людзей да магіі, акультызму, спірытызму.

### ШКОДА КАВАВАЙ ГУШЧЫ

— Варажбітка ніякім вартым чынам не можа прадказаць будучыню. Гэтыя метады невядомыя сучаснай навуцы і яны не прымаюцца царквой. Што такое карты таро? Які навуковы метад спасціжэння інфармацыі тут прымяняецца? Карты як нейкі спірытычны канал — магчыма. Варажбітка можа карыстацца любым сродкам, які падаецца нам бясшкодным — кававай гушчай, напрыклад. Гэта толькі сродак, які дапамагае ўвайсці ў кантакт з нячыстай сілай і чалавека падмануць. Як правіла, заманьваюць варажбіткі тым, што гавораць нейкія факты з мінулага, таму што будучыня ім недаступная. А мінулае бесу можа быць вядомае. Сказаўшы некалькі фактаў з мінулага, варажбітка чалавека зацікавіць, ён пачынае ёй верыць. А далей яна кажа пра будучыню нешта такое, што чалавека можа дэмаралізаваць, зрабіць яго безабаронным. Няўжо камусьці траплялася хоць адна варажбітка, якая сказала б чалавеку: «Да ў цябе ўсё добра, твая будучыня шчаслівая?» Варажбітка заўсёды палохае. Таму што напалоханы чалавек пачынае мітусіцца, шукаць сродак ратавання. Ён трапляе ў сеткі, і яна працягвае: «Цябе агаварылі, сурочылі. Толькі я магу дапамагчы». Яна пачынае здымаць з яго грошы. Сетка яе кліентаў пашыраецца: бо ён жа іншым расказаў пра яе празарлівасць. Так на падмане і залежнасці людзей будуецца гэтая практыка.

### МАГІЯ «ПСІХУШКІ»

— Чаму мы так актыўна выступаем супраць акультызму, магіі, варажбы, астралогіі? Таму што наша паўсядзённая праца ў храме, сустрэчы з людзьмі, якія займаліся гэтымі практыкамі, прымушаюць біць трывогу і папярэджваць грамадства. Усе людзі, якія звярталіся да экстрасэнсаў, да магаў, маюць вялікія духоўныя праблемы. Таму што калі экстрасэнс проста падманшчык, то ён карысці чалавеку не прынясе, але возьме ад яго грошы. Закрыем на гэта вочы: чалавек можа траціць грошы на што хоча — на любыя забавы. Але калі б магі і прадказальнікі былі простымі махлярамі, то гэта была б палова бяды. Аднак шмат якія экстрасэнсы і магі маюць кантакт з нячыстая сілай, калі «падключаюцца» да нейкіх каналаў. Такім чынам, чалавек, які прыйшоў на кансультацыю да такога спецыяліста, звяртаецца да бесаўства, а бес ніколі не дапаможа чалавеку. Адзіная яго мэта — знішчыць хоць адну чалавечую душу, а калі ўдасца, то і не адну. Пасля зваротаў да экстрасэнсаў жыццё можа пайсці наперакасяк. У чалавека з'яўляюцца духоўныя праблемы. Некаторыя трапляюць у псіхіятрычныя лякарні. Людзі, якія асабліва захапляліся гэтым, канчаюць жыццё самагубствам. Такая статыстыка таксама ёсць у царкве.

Лекаваць такіх ахвяраў магчыма, калі з імі правільна і доўга працаваць, калі вывесці іх на шлях Боскага пазнання. Таму што толькі адзін Гасподзь па-за часам. І наша мэта — не ў тым, каб даведацца пра сваю будучыню, а гэтую будучыню ствараць. Чалавек сваю будучыню творыць штодня кожным сваім крокам. Але можа і не ствараць, пераўвасобіўшыся ў раба. Я назіраў людзей, якія звярталіся па дапамогу да астролагаў кожны месяц. Бралі прагноз на месяц, а потым астролаг некуды з'ехаў. Чалавек аказваецца дэмаралізаваны, не ведае, што рабіць, як паступіць у той ці іншы дзень. Хоць сам прагноз, які даваў астролаг, змяшчаў агульныя сказы. Атрымліваецца, што чалавек знаходзіцца ў рабстве ў астролага, сам не можа будаваць сваю будучыню.

Але не ўсе прыходзяць у храм, шмат якія людзі пацярпелі і нікому пра гэта не кажуць. Мы пастаянна ў Мінскім кафедральным саборы вядзём прыём гэтых людзей. І яны ідуць...

— На жаль, даводзіцца чуць такое меркаванне, што духоўнасць — не толькі ў веры, у царкве. Паганскія абрады, магію, астралогію людзі недасведчаныя адносяць да духоўнасці. Але нічога агульнага паміж імі няма, — падводзіць выснову Айцец Аляксандр. — Дух — параджэнне Боскае і ён не можа быць цёмным. Ён светлы і імкнецца да святла. Нясе радасць адчування кожнага моманту і яму не трэба зазіраць наперад.

### «ЛУБОЧНАЕ ХРЫСЦІЯНСТВА»

Такое азначэнне прывяла **Алена МІХАЛЕНКА, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, рэдактар газеты «Уваскрэсенне»**. Гэта датычыцца тых асобаў, якія ці то па няведанні, ці то свядома імкнуцца і ў царкоўнае жыццё прыцягнуць нейкі акультызм.

— На жаль, я чую гэта нават ад людзей з навуковымі ступенямі, якія пазіцыянуюць сябе як праваслаўныя асветнікі. Мне гэта вельмі балюча чуць. Літаральна нядаўна я была сведкам таго, як адзін чалавек расказваў людзям на поўным сур'ёзе, колькі паклонаў ад якой хваробы трэба рабіць, каб дакладна вылечыцца... Гэта ненармальна. Хрысціянін павінен быць перш за ўсё дасведчаны, пісьменны.

Так. Але людзі любяць таямніцы. Яны шукаюць таямніцы, якія б раз і назаўсёды вырашылі б іх праблемы цудадзейсным чынам і гатовыя на страты і ахвяры. І чамусьці не думаюць пра тое, што насамрэч ёсць адна таямніца, якая даўно раскрыла сакрэт чалавечага шчасця: ахвяраваць сабой дзеля іншых. Ды хто ж з сучасных магаў гатовы да гэтага...Тады чаму нехта яшчэ верыць у іх таямніцы?..

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

